Падпіска на "Газету Слонімскую" заканчваецца 25 сакавіка!



Кошт падпіскі на месяц 200 рублёў. Падпісны індэкс 64042



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

Месца Вашай рэкламы т. 2-49-39

№13 (146). 23 — 29 сакавіка 2000г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 60 руб.

ПАМІЖ МОЛАТАМ і накавадлам

17 сакавіка на Слонімскім міжраённым аўтатранспартным прадпрыемстве адбыліся хваляванні рабочых.



Фота Віталя ГІЛЯ

Рабочыя абмяркоўваюць свае праблемы

У той дзень у 14 гадзін каля сотні чалавек сабралася ў клубе прадпрыемства і чакалі начальніка Мікалая Іванавіча Фідрыка. У 14.20 ён з'явіўся. Аказалася, што пра "забастоўку" і сход рабочых Мікалай Фідрык нічога не ведаў. Старшыні прафкама не было зусім...

Работнікі аўтатранспартнага прадпрыемства гаварылі пра набалелае: пра прастої машын, адсутнасць запчастак, пра малую зарплату, пра тое, што даводзіцца браць адпачынкі за свой кошт. Людзі былі незадаволены і работай адміністрацыі, якая атрымлівае, на іх думку, непараўнальна большую, чым у шэраговых работнікаў, зарплату. Былі ўзняты і іншыя праблемы. Аднак размова начальніка прадпрыемства з рабочымі працягвалася нядоўга. Мікалай Фідрык прапанаваў сабраць сход калектыву ў панядзелак, на які ён хацеў запрасіць раённае начальства.

Па словах Мікалая Фідрыка, у панядзелак сход калектыву адбыўся. На ім рабочым было паведамлена, што ніякіх парушэнняў у налічэнні зарплат работнікам адміністрацыі няма. Фідрык сказаў, што ў студзені ён атрымаў толькі на тысячу рублёў больш за свайго сакратара. А ў мінулым годзе яго зарплата ў сярэднім складала 35 мільёнаў рублёў. Наогул, на прадпрыемстве сярэдняя зарплата цяпер складае 31 тысячу рублёў.

"Спачатку рабочыя не верылі, — гаворыць Фідрык. — Не паверылі галоўнаму эканамісту. Тады я даў слова другому эканамісту, якому давяраюць. Больш таго, мы паведамілі рабочым, што зарплата ў іх павялічваецца на 20%".

Зразумела, што гэтым павелічэннем зарплаты ўсе праблемы на прадпрыемстве вырашаны не будуць. Па словах Мікалая Фідрыка, на рахунку прадпрыемства "грошай няма і невядома, калі будуць".

Няма за што купляць запчасткі, бензін, салярку. Шэраг прадпрыемстваў (мясакамбінат, завод сухога абястлушчанага малака і іншыя) маюць запазычанасць перад аўтатранспартным прадпрыемствам. "І калі выб'ю ў іх грошы, то нешта будзем мець", — гаворыць Фідрык.

Начальнік адзначыў, што на сённяшні дзень зменшыліся перавозкі малака па Слоніму на 50%, а па Дзятлаву на 40%. Мясакамбінат у месяц заказвае толькі 1-2 машыны. Усе рэфрыжэратары прастойваюць. Іх спрабавалі прадаць, але яны нікому не патрэбны...

Што ж далей? Начальнік міжраённага аўтатранспартнага прадпрыемства лічыць, што "перспектыва не вельмі добрая". Дзе выйсце, ён пакуль не ведае. "Сёння начальнік прадпрыемства знаходзіцца паміж молатам і накавадлам: і знізу ціснуць, і зверху...", — сказаў Мікалай Фідрык.

Сяргей ЁРШ

СЛОНІМЦЫ! Віншуем усіх са святам, Днём Волі!

25 сакавіка 1918 года была ўтворана незалежная дзяржава — Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), якую прызналі многія краіны. І з таго часу нам даводзіцца бараніць нашу незалежнасць. Вось і цяпер нас зноў вырашылі інтэгрыраваць у склад Расіі. Дай нам Бог сілы адстаяць незалежнасць, каб жыць у вольнай і багатай еўрапейскай дзяржаве.

Запрашаем усіх на святочны мітынг, прысвечаны Дню Волі.

Мітынг адбудзецца 25.03.2000 года з 12.00 да 14.00 на пляцоўцы па вуліцы Брэсцкай.

Аргкамітэт "Вясна-2000"

Што пасееш, тое і пажнеш

Сёлета ў Слонімскім раёне пад яравыя культуры будзе адведзена 12576 гектараў, з іх 10546 га — пад збожжа.

Каб атрымаць добры ўраджай, неабходна ўнесці 9208 тон мінеральных угнаенняў. У наяўнасці маецца 7289 тон, ці 79% ад неабходнага.

Як паведаміла начальнік дзяржаўнай насеннай інспекцыі Святлана Сергіенка, калгасы і саўгасы цалкам забяспечаны насеннем да сяўбы. З 51157 цэнтнераў нарыхтаванага па плану насення, толькі 50 цэнтнераў яравой пшаніцы не адпавядае патрэбнай кандыцыі. Горшы стан з насеннем шматгадовых траў: з 847 цэнтнераў толькі 62% насення адпавядае неабходнай кандыцыі.

Па словах галоўнага інжынера райсельгасхарчу Івана Арочкі, цяпер у раёне адрамантавана 88% трактароў МТЗ (458 з 521).

— Галоўная праблема — з палівам. Для правядзення сяўбы неабходна 2000-2200 тон дызпалiва і 800-900 тон бензіну. У цяперашні час у гаспадарках маецца ў наяўнасці ўсяго 200 тон саляркі і каля 50 тон бензіну. На нафтабазе ёсць гаручае, але гаспадаркі не маюць сродкаў для яго набыцця... — адзначыў галоўны інжынер.

Валянцін ЧУРЫЛА

На "летні" час

З 26 сакавіка па 29 кастрычніка 2000 года ў рэспубліцы ўстанаўліваецца "летні" час.

У сувязі з гэтым стрэлкі гадзіннікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у 2 гадзіны 26 сакавіка 2000 года пераводзяцца на 1 гадзіну ўперад.

У вясковай моладзі — свой бюлетэнь

"Вятрак" — так называецца бюлетэнь, першы нумар якога выдала аднайменнае творчае маладзёжнае аб'яднанне ў вёсцы Мірная, што ў Слонімскім раёне.

"ГС" ужо пісала пра школьную моладзь з вёскі Мірная, якая прапагандуе беларускую культуру, мову, гісторыю. Дзеці стварылі ўласную бібліятэку. У сакавіку невялікім накладам з'явіўся першы нумар друкаванага выдання аб'яднання. У "Вятраку" ёсць літаратурныя творы, цікавае інтэрв'ю і звесткі пра выдаўцоў. Бюлетэнь мае ілюстрацыі.

Сяргей ЁРШ

Свята ахвярапрынашэння

На мінулым тыдні слонімскія мусульмане адзначалі Курбан-байрам.

Гэтаму рэлігійнаму святу ахвярапрынашэння тысячы гадоў. У гэты дзень мусульмане ходзяць адзін да аднаго ў госці, віншуюць сваякоў і блізкіх, прыносяць у ахвяру барана.

У Слоніме з нагоды Курбан-байрама адбыліся святочныя ўрачыстасці, у мячэці прайшоў малебен.

Алег ТАЧОНЫ

Телевизор взорвался — дом сгорел

В минувшую субботу сгорел дом, который принадлежал жительнице деревни Новосёлки Слонимского района Валентине Кузюто.

Пожар возник в результате взрыва телевизора. По предварительным подсчетам, ущерб от огня составил более одного миллиона рублей.

Валентин ЧУРИЛО

МАРШ СВОБОДЫ-2

15 марта в Минске около 25 тысяч человек приняли участие в акции оппозиции "Марш Свободы-2", посвященной 6-й годовщине принятия Конституции Республики Беларусь.

Участники акции прошли 4-километровый путь по проспекту Франциска Скорины, улицам Сурганова и Богдановича к автостанции "Кульман", где состоялся митинг. На нем выступили депутаты Верховного Совета Беларуси 13-го созыва, лидеры оппозиционных партий, а также бывший премьер-министр Михаил Чигирь. Он заявил, что главная беда Беларуси — отсутствие в республике народной власти. По его словам, в то время как весь мир стремится к прогрессу, Беларусь идет в обратном направлении...

(Продолжение темы на 2 стр.)



Фота IREX/ProMedia

ГОРЯЧАЯ ВЕСНА 2000 года

"Прошедший 15 марта в Минске Марш Свободы-2 стал очень удачной акцией, которая "заложила прочную основу под "горячую весну 2000 года", — такое мнение в интервью БелаПАН высказал ответственный секретарь управы БНФ "Адраджэньне" Вячеслав Сивчик.

"После Марша Свободы-2 ни у Москвы, ни у Запада, ни в самой Беларуси не должно быть иллюзий, что белорусский народ согласится с аншлюсом и существованием диктатуры в центре Европы. Единственный мирный выход из тупика, в который загнал страну сегодняшний режим, — свободные, демократические выборы, но без уличных акций их не будет. Оппозиция будет сражаться за право белорусского народа выбирать власть, и для этого нужна "горячая весна 2000 года", которая проводится под понятными народу лозунгами: независимость, переговоры, победа", — сказал В.Сивчик.



Участники Марша Свободы-2. Минск, 15 марта

Ответственный секретарь управы БНФ выразил надежду, что 25 марта, в день 82-й годовщины провозглашения Белорусской Народной Республики, "минские улицы вновь увидят людское половодье, как это было в 1996 году".

Дмитрий ВЛАСОВ

Редакцию "Навінак" задержали

Шестеро сотрудников белорусской молодежной негосударственной сатирической газеты "Навінкі" были задержаны после Марша Свободы-2 в Минске вечером 15 марта.

Как сообщил один из работников газеты Юрий Стефанишин, около 21.30 они выходили из кафе "Ласточка" по улице Богдановича, когда неизвестные люди в штатском схватили их и насильно усадили в машины с частными номерами "ММ". Молодых людей доставили в Советское РУВД Минска и без каких-либо объяснений продержали там до половины первого ночи. Единственным косвенным объяснением происшедшего стала фраза майора милиции, который сказал задержанным:


"Ну что, ребята, хорошо погуляли? Посидите еще".

БелаПАН

ДЗЕНЬ ВОЛІ

25 сакавіка беларускія патрыёты ва ўсім свеце будуць традыцыйна адзначаць Дзень Волі.

У гэты дзень, у далёкім 1918 годзе, у Мінску Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціла незалежнасць нашай краіны. І хоць тады беларускую дзяржаву ліквідавалі акупанты, а большасць яе стваральнікаў знішчылі, БНР засталася ідэалам для беларускіх патрыётаў, сімвалам вызвалення пасля стагоддзяў няволі.



Паштоўка, 1918г.

Дзень Волі ніколі не святкаваўся ў Беларусі на дзяржаўным узроўні. Замест яго, як дзень незалежнасці, улады адзначалі 27 ліпеня (у гэты дзень у 1990 годзе Вярхоўны Савет Беларусі прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі), а цяпер — 3 ліпеня (у гэты дзень у 1944 г. Мінск быў вызвалены ад фашысцкіх захопнікаў).

Дзень Волі людзі калісьці адзначалі ў Беларусі патаемна, а з 1990 года — адкрыта. Звычайна 25 сакавіка праводзяцца ўрачыстыя вечарыны, мітынгі і дэманстрацыі. Вось і ў суботу, 25 сакавіка, у Мінску пройдзе святочнае шэсце і мітынг, арганізаваныя прадстаўнікамі беларускіх апазіцыйных партый і арганізацый.

ЯНА ХВАЛЮЕЦЦА ЗА ЛЁС БЕЛАРУСІ

Наша зямлячка Надзея Дземідовіч жыве ў Калодзішчах пад Мінскам. Ёй 73 гады. Яна піша вершы. Не гледзячы на інваліднасць, удзельнічае ва ўсіх дэманстрацыях апазіцыі, бо хвалюецца за лёс Беларусі.



Надзея Дземідовіч

На маё пытанне, што значыць для яе 25 сакавіка, Надзея Дземідовіч адказала: "Для мяне гэта вялікае свята, як і для кожнага свядомага беларуса — дзень незалежнасці. Яшчэ ад таты я ведала пра 25 сакавіка. Казаў ён, што маглі беларусы быць не пад палякамі ці бальшавікамі, а самі кіраваць сваёй краінай...".

Надзея Дземідовіч нарадзілася на хутары, недалёка ад вёскі Новадзевяткавічы Слонімскага раёна. З маленства бацькі прывівалі ёй беларускасць, выхоўвалі чалавечы гонар і годнасць. Перад вайной бальшавікі "раскулачылі" небагатую, вялікую сям'ю Дземідовічаў, арыштавалі гаспадара, які выйшаў на волю ў чэрвені 1941-га.

Падчас нямецкай акупацыі Надзея вучылася ў слонімскай прагімназіі, была сяброўкай Саюза беларускай моладзі (СБМ), пачала пісаць вершы, уваходзіла ў літаб'яднанне маладых слонімскіх паэтаў, якім кіраваў Сяргей Новік-Пяюн, а пасля Сяргей Хмара. Разам з жонкай Новіка Людмілай Надзея Дземідовіч хадзіла ў нямецкі астрог, дзе ўтрымліваўся паэт. Ён хварэў, ляжаў у шпіталі. Людміла Новік была на гэтай сустрэчы з маленькім сынам, з якім пазней яна загіне ў канцлагеры...

13 снежня 1944 года савецкая дзяржбяспека правяла ў Слоніме арышты былых сяброў СБМ. Арыштавалі іх за тое, што любілі Беларусь... Надзея Дземідовіч выпадкова ўратавалася, доўга хавалася ў сваякоў, знаёмых. Знайшлі яе чэкісты толькі ў верасні 1949 г. у Казахстане. На допытах ее страшна катавалі. Прысудзілі да 25 гадоў канцлагераў.

Яна вытрымала ўсё, выжыла і вярнулася на Бацькаўшчыну. Вучыцца ўжо не выпадала, бо прападала памяць — наследства турэмных катаванняў. Але Надзея Дземідовіч не шкадуе пра выбраны шлях ды згубленую маладосць. Гаворыць, што мала паспела зрабіць для Беларусі, але спадзяецца, што справу яе пакалення працягнуць маладыя беларускія патрыёты.

Сяргей ЁРШ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ НАРАДЖАЛАСЯ Ў НАШЫХ СЭРЦАХ

Сярод слонімцаў-дзеячоў Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918-20 гадах вылучаецца постаць Хведара Данілюка.

Хведар Данілюк нарадзіўся ў 1887 годзе ў вёсцы Сурынка Слонімскага павета ў сялянскай сям'і. Да пачатку першай сусветнай вайны ён паспеў скончыць народнае вучылішча і духоўную школу пры Жыровіцкім манастыры. Данілюк працаваў настаўнікам у вёсцы Забулле, пасля служыў псаломшчыкам на Кобрыншчыне.



Хведар Данілюк

Хведар Данілюк прайшоў усю вайну, стаў афіцэрам. Лютаўская рэвалюцыя застала яго на Румынскім фронце. Ён далучаецца да руху беларускіх вайскоўцаў, якія імкнуліся стварыць нацыянальную армію. Пазней Данілюк успамінаў: "Яшчэ да першай сусветнай вайны і падчас яе мне давялося бачыць шмат куткоў былой Расійскай імперыі. І дзе я толькі не затрымліваўся, расійцы дапякалі мяне за мой нячысты акцэнт, называючы мяне палякам, а палякі, наадварот, звалі кацапам. Чужым і адзінокім адчуваў я сябе ў шматлюднай Расіі. Тады яшчэ слова "беларус", у выніку русіфікатарскай палітыкі расійскага ўраду, не мела значэння прыналежнасці да адной нацыі, а ўжывалася хутчэй як адзнака паходжання з "Северо-Западного края". Нацыянальная свядомасць нараджалася ў нашых сэрцах, перамагаючы пакінутыя чужынцамі погляды і фальшывыя ўяўленні. Звацца беларусам тады значыла прыцягваць да сябе ўвагу начальнікаў і паддавацца бясконцым допытам і перасцярогам.

Памятаю, калі я ў афіцэрскай школе, усвядоміўшы канчаткова, хто я, запісаўся беларусам, мой курсавы афіцэр сказаў мне: "Ты рызыкант, калі ў вайну наважыўся напісаць, што беларус, а не рускі". Гэтак было сярод інтэлігенцыі, што ж казаць тады аб рабочых і сялянах! Народная гушча ў большасці яшчэ спала. Толькі лічаныя адзінкі пашыралі нацыянальныя ідэі і намагаліся пацягнуць народ да светлае будучыні...".

На Румынскім фронце наш зямляк у 1917-18 гг. актыўна фарміраваў беларускія вайсковыя аддзелы, якія імкнуўся перавезці на Бацькаўшчыну для абароны БНР. Аднак немцы і румыны перашкодзілі гэтаму. Тады Данілюк вяртаецца ў Беларусь сам, удзельнічае ў Слуцкім антыбальшавіцкім паўстанні. Пасля паражэння Беларускай Народнай Рэспублікі і яе падзелу акупантамі, Данілюк прысвячае сябе рэлігійнай дзейнасці — ён стаў праваслаўным святаром. Аж да 1944 года служыў настаяцелем у прыходах Слонімшчыны і Навагрудчыны. Неаднаразова яго арыштоўвалі "за антыпольскую дзейнасць"...

У верасні 1939 г. айцец Хведар Данілюк быў арыштаваны бальшавікамі і разам з сям'ёй апынуўся ў турме. Толькі дзякуючы паказанням сумленных сведкаў, ён аказаўся на волі. У час нямецкай акупацыі ў Мінску айцец Данілюк удзельнічаў у з'ездзе праваслаўнага духавенства, на якім была заснавана Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква. Вернасць ідэі беларускай аўтакефаліі айцец Данілюк захаваў да канца жыцця, якое закончыў на эміграцыі, у ЗША.

Сяргей ЁРШ

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі 2-14-39
..........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядамі рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 21 сакавіка 2000г.
Час падпісання 16:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
Наклад 8500 экз.
Заказ №1207
© «Газета Слонімская»
Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓡ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Пенсии ветеранам увеличат

Возможно, в ближайшее время в Беларуси будут увеличены пенсии ветеранам Великой Отечественной войны.

О своем намерении подписать соответствующий указ заявил Александр Лукашенко, выступая в Палате представителей Национального собрания 14 марта. По словам главы государства, указ он планирует подписать в ближайшее время.

Работники предприятий стали хуже питаться

"Как изменилось за последнее время питание Вашей семьи?", — с таким вопросом к руководителям, специалистам, служащим и рабочим различного уровня квалификации обратились социологи аналитического центра мониторинга социально-трудовой сферы НИИ труда.

Более половины (65%) из 1500 ответивших на вопросы этой анкеты сказали, что питание членов их семей в последнее время ухудшилось. 28 процентов опрошенных не заметили никаких изменений. И только 2% респондентов отметили изменение уровня питания своих семей в лучшую сторону. Остальные затруднились ответить на предложенный вопрос.

Только 4% респондентов, ответивших на очередной вопрос: "Удалось ли Вам отложить какую-либо сумму за последние полгода?" – сказали: "Да". Подавляющее же большинство опрошенных – 96% – за последние полгода не смогли ничего отложить на будущее.

БелаПАН

Імша на роднай мове

Да нядаўняга часу ў Дзятлаўскім касцёле богаслужэнне вялося толькі на польскай мове.

Але далёка не ўсе каталікі Дзятлава ёю валодаюць. Таму было вырашана праводзіць малебен на роднай мове. Цяпер ранішняя імша ў касцёле вядзецца на польскай мове, а пазнейшая – на беларускай.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

На 660 вучняў — адзін тэлевізар

У другой зэльвенскай сярэдняй школе займаецца 660 вучняў. На ўсіх іх у школе толькі адзін тэлевізар. Дарэчы, тэлевізары тут не набываліся ажно з 1973 года.

У гэтай школе ёсць праблема і з мэбляй, бо за 15 апошніх гадоў тут ніякай мэблі не куплялі. Дзеці і настаўнікі сваімі сіламі рамантуюць парты і крэслы.

Музычная школа без баянаў

Дзярэчынская музычная школа Зэльвенскага раёна засталася без баянаў.

Бо тыя, якія школа мае, даўно трэба спісваць. Аддзел культуры сёння новыя баяны купіць не можа, бо яны дорага каштуюць.

Пра гэта на чарговай сесіі Зэльвенскага райсавета гаварыла загадчыца Зэльвенскага аддзела культуры Г.Раманчук.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОШТА

ДЗЕ ПАДРУЧНІКІ?

Праблема, аб якой я хачу паведаміць, паўстала яшчэ ў 1997 годзе. Міністэрства адукацыі вырашыла браць плату за падручнікі. Мы нават узрадаваліся гэтай рэформе, і нашы бацькі добрасумленна выплацілі пэўную суму. Усе думалі, што на гэтыя грошы будуць надрукаваныя новыя падручнікі, што мы, нарэшце, перастанем карыстацца СССРаўскімі. Але што мы бачым цяпер? Сітуацыя зусім не змянілася, а нават пагоршылася. Падручнікаў у школе не хапае, дзецям выдаюць адзін падручнік на траіх або чацвярых, пры гэтым мы аплочваем падручнікі на кожнага вучня.

Нам абяцаюць, што з кожным годам будзе лепш, але дзе яно тое "лепш". Вучыцца стала немагчыма, а настаўнікі не звяртаюць увагі на тыя цяжкасці, якія датычаць школьнікаў. Калі мы звяртаемся да іх са скаргай і просім дапамагчы, яны пасылаюць нас у міністэрства, абласны ці раённы аддзелы адукацыі. А што нам рабіць, мы так і не можам зразумець, як і не можам зразумець, куды пайшлі тыя грошы, якія мы заплацілі за падручнікі? Новыя кнігі застаюцца толькі ў нашых марах. Здаецца, што, акрамя нас, гэта нікога не хвалюе.

Напрыклад, у нашым класе не ўсе атрымалі падручнікі па гісторыі нашай краіны, а таксама па замежнай мове і сусветнай гісторыі. Узнікла пытанне: куды глядзіць наша міністэрства адукацыі і чым яно займаецца, калі не можа вырашыць такое важнае для нас пытанне? Хіба можна цяпер спадзявацца на сапраўдныя веды, атрымаць іх у школе, калі краіна не можа забяспечыць нас патрэбнай літаратурай?

Вольга А., СШ №5 г.Масты

Добрая справа караецца

Першы нумар вучнёўскай газеты "Школьныя навінкі" не застаўся па-за ўвагаю мастоўскага начальства.

Намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама Таісія Мурына неадкладна выклікала дырэктара СШ № 5 Анатоля Яблонскага ды запатрабавала разабрацца з дзяўчатамі з гэтай школы, якія распачалі выдаваць газету для дзяцей. Да гонару выдаўцоў газеты Тані Гладухавай і Вольгі Дзятлоўскай, сваё першае жыццёвае выпрабаванне яны вытрымалі, не спалохаліся непаразуменя старэйшых і распачатую справу будуць працягваць. Хутка з'явіцца другі нумар школьнай газеты.


Штаб дзейнічае

Мастоўскі райвыканкам рыхтуецца да вясенніх палявых работ. Ужо ўтвораны штаб па падрыхтоўцы да гэтай кампаніі.

Штаб узначаліў першы намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Штарноў. Улады не спадзяюцца на калгаснікаў і іх кіраўнікоў, таму было прапанавана прадпрыемствам горада дапамагчы гаспадаркам рабочай сілай і тэхнікай. Выплочваць людзям будуць 60-75% сярэднемесячнага заробку на перыяд сельгасработ.

ГЛЫБІНКА

ДЗЯТЛАВА



У свой час Дзятлава належала гетману Астрожскаму, пасля Сапегам, Палубенскім, Радзівілам, Солтанам. У кожным стагоддзі Дзятлава мела сваё аблічча, а вось дзятлаўчане — не мяняюцца. У іх — уласныя праблемы, свае клопаты і зацікаўленні. Жыццё не стаіць на месцы, хоць час мяняе ўсё. А сведкам часу з'яўляецца і гэты Дзятлаўскі касцёл Успення Багародзіцы (на здымку). За чатыры амаль стагоддзі ён бачыў шмат. Таму хочацца верыць, што лепшае жыццё прыхаджан гэтага касцёла яшчэ наперадзе. Як і ўсіх дзятлаўчан...

Сяргей ЧЫГРЫН

Пойман с поличным

18 марта в 2 часа ночи в Слонимском отделении вневедомственной охраны сработала сигнализация. Сигнал поступил из магазина "Спутник".

На место происшествия наряд милиции прибыл оперативно. С поличным был задержан 27-летний слонимчанин И. Выяснилось, что он разбил стекло универсама, проник в помещение и взял из кассовых аппаратов 46 тысяч 200 рублей.

Мужчина всего два месяца назад вернулся из мест лишения свободы.

Валентин ЧУРИЛО

Старшыня калгаса павысіў сабе заробак

Старшыня калгаса "Чырвоны партызан" Мастоўскага раёна Браніслаў Чарнец, нягледзячы на тое, што няма чым карміць кароў ды своечасова плаціць заробак людзям, павысіў сабе заработную плату да 89 тысяч рублёў.

А яшчэ ён пажадаў, каб у яго двухпавярховым катэджы быў усталяваны ліфт.

Як заўсёды — ёсць цяжкасці

У мастоўскай цырульні па вуліцы Савецкай, 48 на ўсю змену маецца адзін фен і адны шчыпцы для ўкладкі валасоў.

Таму чарга кліентаў узнікае менавіта па гэтай прычыне.

Антон МАКЕЙ

Небяспечная вытворчасць

Па інфармацыі пракурора Мастоўскага раёна Юрыя Васілеўскага, у мінулым годзе на вытворчасці раёна пацярпела 45 чалавек.

У тым ліку з цяжкім зыходам – 3, са смяротным – 1. Усе траўмы з цяжкім і смяротным зыходам адбыліся на ААТ "Мастоўдрэў".

Па веды — 15 км пешшу

Вучні Галубоўскай школы Мастоўскага раёна, якія жывуць у суседніх вёсках, ужо на працягу некалькіх месяцаў на вучобу дабіраюцца за 10-15 км пешшу ці ў трактарным прычэпе.

Школьны аўтобус, які павінен вазіць дзяцей на заняткі, стаіць з-за адсутнасці бензіну.

Зноў затрымка заробку

У гэтым месяцы настаўнікі, медработнікі і іншыя служачыя Мастоўшчыны мелі затрымку выплаты заработнай платы.

Затрымка склала ад 10 да 15 дзён.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Мужчина и женщина в XXI столетии



Калаж Віталя ГІЛЯ

(Начало в №13)

Брак умер. Да здравствует семья!

Теперь необходимо перейти от статистики и констатации фактов к объяснению причин "краха института брака".

Люди часто путают понятия семьи и брака. Греческий писатель Лукиан (120—190 г.г. н.э.) сказал, что брак обеспечивает необходимую преемственность рода человеческого. Говоря юридическим языком, брак — это добровольный, равноправный союз мужчины и женщины, ведущих совместное хозяйство, предполагающий половые отношения и ставящий целью рождение и воспитание детей, уход за ними. Брак может либо официально регистрироваться в виде акта гражданского состояния, либо носить более свободный, "гражданский" характер. Семья же — это группа живущих вместе людей, имеющих ту или иную степень родства.

В нашей стране много так называемых неполных семей, где деда убили на войне, мать развелась с отцом-пьяницей, а внучка — феминистка. Некоторые мыслители видят в этом особый демографический путь России. Я все-таки надеюсь, что у нас хватит благоразумия, чтобы не превратиться в "страну амазонок". Ибо этот вариант позволяет только выжить, но не развиваться. В каменном веке существовал женский род с бабушкой во главе и случайными отцами. Тогда почти не было погребений — "ненужных" детей просто убивали, а "заживших-ся" стариков из соображений гуманности не трогали, а оставляли умирать в степи... И эта длительная по календарному, геологическому времени эпоха практически не оставила после себя никаких культурных ценностей. Кстати, и сегодня живущие так некоторые племена Африки и Океании не смогли изобрести даже колеса, не то что велосипеда.

В последнее время также много говорится и о том, что семья будущего — полигамная. С этим трудно согласиться. Во-первых, любая семья накладывает на всех ее членов определенные права и обязанности. Эти права и обязанности закрепляются законодательно. С точки зрения права, в полигамной семье одна жена юридически не должна будет ничем отличаться от другой и от третьей. Ну, скажите мне, какая женщина согласится на такие условия? Во-вторых, женщине вообще не свойственна полигамия, она не захочет терять права на собственную постель. Даже когда женщина изменяет мужу, она очень часто смотрит на своего нового партнера как на потенциального супруга, оценивает его в качестве отца своих будущих детей. Это своеобразный голос крови, генетический код, если хотите. Он связан с биологическим предназначением женщины: родить и воспитать жизнеспособное потомство.

Теперь поговорим о том, по каким сценариям скорее всего будет развиваться семья. Возможно, одной из распространенных форм супружеских отношений станут "гостевые" браки. Иными словами, супружеские отношения будут занимать не все время, а проходить "сеансами". Скажем, несколько раз в неделю, в месяц, или даже в год, муж и жена живут вместе, семьей. Все остальное время каждый из них свободен от рутины повседневных обязанностей и живет своей жизнью.

Еще одна перспективная форма супружества — экстерриториальные браки. И у нее, и у него — свой дом, совместное хозяйство они не ведут. Встречаются на работе, вместе ужинают в кафе, проводят отпуск вдвоем на Канарах или в Крыму, ходят в гости друг к другу. В таком браке есть свои плюсы и свои минусы. С одной стороны, они ограничивают возможность партнеров вмешиваться в привычки и стиль жизни друг друга, увеличивают потенциал их самореализации. С другой — создают определенные сложности в воспитании детей и уходе за ними.

Еще одно из существующих сегодня направлений трансформации классической моногамии — в последовательную моногамию. В течение жизни человек нередко последовательно вступает в несколько моногамных браков, которые исходно не предполагались. Сегодня нередко эта так и происходит. Бесспорно, это не лучшее, что можно придумать для воспитания ребенка, но многим женщинам это приносит ощущение внутреннего комфорта.

Говоря о семье будущего, хочется отметить, что число союзов, в которых молодая женщина несет в большей степени полоролевую функцию любовницы или наложницы, чем собственно жены, в рамках бесправного патриархального или просто равнопартнерского конфликтного брака, будет расти. Уже сегодня это выход для людей высокой занятости, специфических видов деятельности или особенностей характера.

"Кто виноват?" или "кому это выгодно?"

Все очень просто. Раньше верность супругов была необходима как гарантия ответственности за жизнь собственного потомства. Сейчас, в эпоху безопасного секса и резко возросшего числа коммуникаций, особенно при городском типе проживания, свобода личности каждого из супругов не менее важна для психического здоровья как их самих, так и их детей. Только когда выбор в пользу брака мужчина и женщина будут делать без какого бы то ни было нажима со стороны, только тогда можно будет сказать, что новая семья создается во имя счастья, любви и преемственности, а не ради престижа и установившейся ранее традиции.

Общество меняется, становится более открытым. У людей появляется больше выбора. Если десять веков назад женщина за всю свою жизнь встречала 5—6 потенциальных партнеров по браку, то сейчас в крупном городе она встречает их около 150 тысяч. Кроме того, традиционная материальная зависимость женщины от работающего мужа, бытовая зависимость работающего мужа от жены, ведущей его домашнее хозяйство, и зависимость обоих от общественного мнения сегодня сходят на нет. Поэтому отношения мужчины и женщины все чаще строятся на обоюдном доверии партнеров и стремлении быть счастливыми вместе.

Кроме того, семья, как любое общественное образование, подчиняется закону "малых социальных групп", а это предполагает наличие иерархических отношений, плохо уживающихся с идеями "равного партнерства". В нынешних условиях индустриального общества, эмансипации, урбанизации, равного участия женщины в производстве, ее экономической независимости, наличия у нее права самой выбирать стиль полового поведения и количество партнеров, моногамный брак дает серьезный сбой. Структура традиционного патриархального брака была заложена "не под те условия", которые мы имеем сегодня.

Формальная сторона брачных отношений в виде института государственной регистрации будет ослабляться по мере того, как будет развиваться некий новый уровень обеспечения преемственности. Если мы будем двигаться по тоталитарному пути, брак снова будет все сильнее идентифицироваться, сливаться с семьей. Если мы продолжим движение в либеральном направлении, брак и семья будут находится на определенном расстоянии друг от друга.

Андрей АКОПЯН

(Продолжение в следующем номере)

інтэрв'ю з цікавай жанчынай

Галіна Прэдка:
"ЛЮДЗЕЙ ТРЭБА ШКАДАВАЦЬ"



— Галіна Васільеўна, Вы юрыст па прызванню ці таму, што так склаўся лёс?

— О, гэта блакітная мара майго юнацтва! Іншай справы для сябе і не ўяўляла.

— І лёгка было здзейсніць мару?

— Цяжка, але цікава. Я выйшла замуж у 19 гадоў і адно за адным нарадзіла двое дзетак — спачатку сына, а потым дачушку. Муж, які да гэтага працаваў участковым інспектарам РАУС, паступіў на стацыянар у Акадэмію ўнутраных спраў СССР, філіял якой знаходзіўся ў Мінску. Я заявіла, што таксама буду вучыцца, і паступіла ў БДУ на факультэт правазнаўства. Гадавала дзетак і вучылася завочна. Мы жылі ў Мінску на прыватнай кватэры: чатыры чалавекі на дзевяці квадратных метрах. Уяўляеце? Але я вырашыла не адставаць ад мужа. Таму, нягледзячы ні на што, дамаглася атрымаць вышэйшую адукацыю.

— Вы з Іванам Сяргеевічам землякі, ці не так?

— Абое вучыліся ў адной школе ў Мастах. Пасля вучобы мы і працаваць вярнуліся ў Мастоўскі раён, а потым мужа перавялі ў Дзятлава.

— І такіх пераездаў, наколькі я ведаю, у Вашым жыцці было вельмі шмат...

— Божа, дзе мы толькі не жылі! Памятаю, дзеці яшчэ ў школу не хадзілі, як мужа перавялі ў Чукоцкую аўтаномную акругу. Паехалі, вядома, усёй сям'ёй. Пасяліліся ў Анадыры. Дзеці там пачалі вучыцца. Я працавала юрыстам у геолагаразведачнай экспедыцыі. Потым майго Івана перавялі на самы бераг Паўночнага Ледавітага акіяна. Ад нашага дома да акіяна было ўсяго 200 метраў. Працаваць давodзілася шмат. Я нейкі час была суддзёй. Прывыклі на поўначы, палюбілі яе. Там нашы дзеці выраслі, закончылі школу.

— Але ўсё роўна пацягнула на Радзіму?

— Так, сваю мілую Беларусь мы ўспаміналі часта, бачылі яе ў снах, і калі выдалася магчымасць, вярнуліся ў родныя мясціны.

— Вы цудоўная гаспадыня, прыгожая, элегантная жанчына, прафесіянал, якіх пашукаць. Як удаецца ўсё гэта спалучаць?

— Удаецца таму, што вельмі настойлівая, самастойная ў прыняцці любага рашэння, маю на ўсё свой пункт гледжання. Гэта датычыцца і дамашніх спраў, і працы. Напрыклад, некалькі гадоў таму назад я вырашыла стаць адвакатам, так бы мовіць прыватным юрыстам, і, нягледзячы на тое, што працавала і даглядала вельмі хворую маці, ад задумы сваёй не адступілася. Рыхтавалася па начах. Потым паехала ў Мінск здаваць кваліфікацыйны экзамен на атрыманне ліцэнзіі на права займацца адвакацкай дзейнасцю. Здала з першага разу. Займалася прыватнай адвакацкай практыкай. Шкада, што мала, усяго 9 месяцаў. Потым у нашай краіне гэту справу забаранілі. Я ўступіла ў Гродзенскую абласную калегію адвакатаў, і цяпер працую ў Дзятлаве.

— Галіна Васільеўна, вы абараняеце злачынцаў, забойцаў, злодзеяў, сутыкаецеся з імі твар у твар. Што пры гэтым адчуваеце?

— Спагаду і жаль. Я лічу, што людзей трэба шкадаваць. Ніколі не пагаджуся з думкай, што жаль прыніжае. Ды няхай мяне так прыніжаюць па дзесяць разоў на дзень! Калі ў душы чалавека няма жалю і спагады, ён становіцца жорсткім.

Заўсёды стараюся зразумець чалавека, як бы нізка ён не апусціўся ў жыцці. Імкнуся знайсці прычыны, якія прывялі яго да злачынства. Я шчыра спачуваю сваім падабаронным. Яны вельмі няшчасныя. Недзе чула, што ўсе людзі аднолькавыя, толькі лёс у іх розны. З гэтым згодна поўнасцю.

— У Вас ёсць захапленні?

— Іх шмат. Вельмі люблю музыку, асабліва сімфанічную, шмат чытаю, вырошчваю кветкі, з задавальненнем працую на дачы. Кожны дзень абліваюся халоднай вадой. Гэта прыдае энергіі, дапамагае падтрымліваць форму. Вельмі шкадую, што ў Дзятлаве няма тэатра, а выбрацца ў вялікі горад не заўсёды выпадае. Я шчырая паклонніца тэатра.

— Даўно выраслі дзеці... Як яны жывуць?

— Добра. Сын займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю, дачка — эканаміст у "Беларусбанку". Маюць свае сем'і. У мяне растуць двое цудоўных унукаў — хлопчык і дзяўчынка. Так мару, каб хто-небудзь з іх стаў юрыстам. Больш спадзяюся на ўнукаў.

— Як у Вас складваюцца адносіны з зяцем, нявесткай?

— Не хачу хваліцца, але выдатна. Тры гады мы жылі ў адной кватэры з зяцем, пакуль яны не перасяліліся ў сваю. Цяпер ужо тры гады жывём з нявесткай. У нас поўная згода і ўзаемапаразуменне.

— Вы чалавек энергічны, лёгкі на пад'ём?

— Вельмі. Я ж дачка ваеннага будаўніка. Разам з бацькамі жыла ў розных мясцінах, потым, як ужо казала, і са сваёй сям'ёй "падарожнічала". Знаёмых у мяне вялікае мноства.

— А сябровак?

— Іх, на жаль, няма. Можа таму, што я вельмі шчыра сябрую са сваімі сёстрамі, са сваякамі мужа. У нас адна вялікая сям'я.

— Вы так модна апранаецеся, не шкадуеце грошай на абноўкі?

— Я вельмі паважаю сябе і хачу заўсёды выглядаць моднай, акуратнай. Не палічыце гэта нясціплым, але я ўпэўнена: хто паважае сябе, той паважае і іншых.

— Ці ёсць такая катэгорыя людзей, з якімі Вы не хацелі б сустракацца, гутарыць, інакш кажучы, мець справу, бо яны Вам непрыемныя?

— Няма. У кожным чалавеку ёсць нешта добрае. Абавязкова ёсць. І я шукаю гэту рысу. І знаходжу. Ніколі не глядзела і не гляджу на людзей звысоку, нікім не грэбую. Нават лічу гэта за грэх.

— Галіна Васільеўна, Вы шчаслівы чалавек?

— Па-мойму, чалавек не можа быць шчаслівым пастаянна, бо шчасце — гэта як крупінкі золата ў пяску. І калі гэтыя крупінкі збіраць і берагчы, а гэта, паверце, вельмі няпроста, то жыццё будзе святлейшым і прыгажэйшым.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Кроссворд

Составил Владимир ВАШУТА

ПО ГОРИЗОНТАЛИ: 1. Наборная машина. **5**. Склад хранения грузов при железнодорожных станциях, портах. **9**. Наука о законах развития природы, общества и мышления. **10**. При крепостном праве: домашняя прислуга в помещичьем доме. **13**. Настоящая фамилия одного из авторов романа «Двенадцать стульев». **16**. Один ряд, размещенный над другим. **18**. Траурная повязка черного цвета. **23**. Город во Франции. **25**. Краткое и меткое народное изречение. **27**. Крытая повозка. **28**. Столярное ручное сверло. **30**. Один из видов гостиницы. **31**. Русская мера веса, равная 16,38 кг. **32**. Главенствующая идея, основной признак. **33**. Прибор для измерения напряжения в электрической цепи. **37**. Французский футбольный клуб. **38**. Материал для лепки. **39**. Эмблема, опознавательный знак государства, города. **43**. Высший дворянский наследственный или присваиваемый титул в Англии. **45**. Десятичное ракообразное животное. **48**. Ядовитое вещество, продукт некоторых микроорганизмов, животных или растений. **51**. Советский космический корабль. **53**. Город в Кировской области. **55**. Огневое оборонительное сооружение. **56**. Летчик-космонавт СССР.

ПО ВЕРТИКАЛИ: 1. Форменная одежда, для швейцаров, лакеев, кучеров. **3**. Три музыканта или певца. **4**. Осветительный прибор. **5**. Персонаж комедии Д.И.Фонвизина «Недоросль». **6**. Треугольная вставка в платье. **8**. Железная лопата для земельных работ. **10**. Работник, поддерживающий чистоту на улице. **12**. Заразное заболевание крупного рогатого скота. **13**. Река в Грузии. **15**. Видоизменение, разновидность чего-либо. **19**. Высший законодательный орган в Великобритании. **20**. Птица семейства пастушковых. **21**. Участок водной поверхности. **22**. Теплица. **29**. Английская мера длины. **32**. Зубной врач, зубной техник. **34**. Ручной инструмент для строгания дерева. **35**. Устройство в виде движущейся лестницы. **36**. Площадь конных, гимнастических и других состязаний (устар.). **40**. Механизм для подъема и перемещения грузов. **41**. Дом, жилище, приют (устар.). **43**. Стихотворение М.Ю. Лермонтова. **46**. Советский футболист, заслуженный тренер СССР. **49**. Название государства. **50**. Рассеянное звездное скопление в созвездие рака.

ПО ДУГАМ: **2**. Характер. **7**. Растение. **11**. Застекленный проем в стене. **14**. Бог любви в античной мифологии. **17**. Конец позвоночника, примыкающий к костям таза. **24**. Тропическая степь. **26**. Ансамбль из пяти музыкантов. **42**. Название государства. **44**. Щебень, гравий или песок, насыпанный поверх земляного полотна для укрепления шпал. **47**. Оледенелая корка на поверхности снега после оттепели. **52**. Лестница на корабле. **54**. Город на севере Франции.

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД (№12)

ПО ГОРИЗОНТАЛИ: **2**. Филипп. **5**. Феба. **9**. Гальярда. **11**. Акробат. **14**. Иго. **17**. Отава. **18**. Скиф. **19**. Зикурат. **23**. Минарет. **24**. Реферат. **29**. Пастель. **30**. Волк. **31**. Пилон. **34**. Век. **37**. Грамота. **38**. Прометей. **39**. Нева. **40**. Капкан.

ПО ВЕРТИКАЛИ: 1. Аббат. **3**. Илья. **4**. Педиатр. **6**. Пакгауз. **7**. Насест. **8**. Бразилия. **13**. Зевс. **15**. Минерал. **16**. Капелла. **20**. Сак. **21**. «Лес». **22**. Часослов. **25**. Стрелец. **26**. Экипаж. **27**. Пирс. **28**. Кокарда. **35**. Эркер. **36**. Бета.

ПО ДУГАМ: 10. Яхта. **12**. Бриз. **32**. Сера. **33**. Корм.

Анекдоты

от www.cool.ru

☺ 😐 ☹

Прыгает мужик с парашютом. Летит и восхищается в переговорное устройство:

- Какая красота! Какое ощущение свободы! И люди внизу такие маленькие, как муравьи...

Вдруг слышит в наушниках голос инструктора:

- Дергай за кольцо, идиот! Это и есть муравьи...

☺ 😐 ☹

Шейх шепчет одной из своих многочисленных жен:

- Твои глаза горят, как полночные звезды, твои губы - как драгоценные рубины... Передай дальше.

☺ 😐 ☹

Звонок в дверь:

- И хто там?

- Тимуровцы! Воды наносить, дров порубить...!

- Хто?

- Тимуровцы! В магазин сходить, пол помыть...!

- Хто, хто?

- Твою мать!! Тимуровцы! Обед сварить, батарейки в слуховом аппарате поменять...

☺ 😐 ☹

Пьяный муж приходит домой. Жена устраивает ему скандал. Вдруг он заявляет:

- Вот сегодня я к теще лягу.

- Совсем с ума сошел! Бесстыжая рожа! - кричит жена.

- Цыц! - вдруг говорит теща дочери, - мужнино слово закон. Кто в доме хозяин?

☺ 😐 ☹

Встречаются два еврея. Один спрашивает:

- Где ты сейчас работаешь, Абрам?

- В оркестре русских народных инструментов.

- И что, там таки все наши евреи?

- Да нет, есть один русский. Ну ты же знаешь, это такие проныры - везде пролезут!

☺ 😐 ☹

Муж возвращается домой с работы. Усталый и разбитый. Навстречу ему жена.

- Дорогой, ты знаешь, я беременна.

- Как! И ты тоже?

☺ 😐 ☹

Телефонный звонок. 70-е годы:

- Как вы живете? 80-е:

- Как вы? Живете? 90-е:

- Как?! Вы живете?

☺ 😐 ☹

Муж читает газету и говорит жене:

- Я всегда говорил, что женщины слишком болтливы. Вот, пишут, что женщина в день произносит 2200 слов, а мужчина - только 1100.

- А это потому, что женщины вынуждены все повторять дважды!

- Что?

27 сакавіка — 2 красавіка

Праграма ТБ

ад Газеты Слонімскай

Панядзелак, 27 сакавіка

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, **9.00**, **11.00**, **13.00**, **15.00**, **17.00**(с сурдопереводом), **19.00**, **0.05** Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.25 «Сегодня с вами...».
9.50 Здоровье. Тележурнал.
10.15 Детский экран. «Бременские музыканты», «По следам Бременских музыкантов». Мультфильмы.
11.15 «**Кофе с ароматом женщины**». Телесериал.
11.55 «Жизнь зовет». Киноочерк («Беларусьфильм»).
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыкальный салон с Элеонорой Езерской. «Звезды навсегда...»
13.10 К Международному дню театров. Док.фильм «Владомирские».
13.40 К.Гоцци. «Счастливые нищие». Спектакль Белорусского республиканского Театра юного зрителя. Действие 1-е.
14.45 Мультфильм.
15.10 К.Гоцци. «Счастливые нищие». Спектакль. Действие 2-е.
16.25 Театральный калейдоскоп.
16.40 Авто-парк.
16.50 Премьера песни.
17.15 «А музыка звучит...».
18.00 «Благодарность наставнику». Телеочерк о народном артисте Беларуси Якове Кимберге.
18.25 Юмористическая программа «Понедельник с «Христофором».
18.40 Международные спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 «**Кофе с ароматом женщины**». Телесериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 КВН. 1/8 Евролиги.
23.30 Криминальная хроника.
2335 Третий тайм.

ОРТ

8.00 Новости
8.15 «**Нежный яд**». Сериал
9.15 Пока все дома
9.45 Как это было. «Тайна советского стелса. 1984 год»
10.25 Вкусные истории
10.30 Сериал «**Новые приключения Синдбада**»
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе»
14.00 Новости.
14.20 Мультсериал «Охотники за привидениями»
14.45 Что да как
15.00 Звездный час
15.25 ...До 16 и старше
16.00 «**Нежный яд**». Сериал
17.00 Новости. Вечерний выпуск
17.30 «С легким паром!».
18.00 Мы и время
18.40 Погода
18.45 Впервые на телевидении. Сериал «**Огнем и мечом**»
19.45 «Спокойной ночи, малыши!»
20.00 Время. Информационный канал
21.00 Сериал «**Секретные материалы**» («X-files»)
21.55 Взгляд
22.40 Новости. Ночной выпуск
22.55 «Земфира. Первый альбом». Концерт в Риге
23.50 Ночной детектив. Сериал «**Майк Хаммер. Гарлемский ноктюрн**»

РТР

7.00, **8.00**, **16.00**, **19.00**, **22.00** Вести.
7.20 Телеспецназ: «Дежурная часть».
7.35 Семейные новости.
8.20 Квантовая медицина.
8.35 Ура, каникулы! «Пых - волшебный Дракон». Мультфильм.
9.00 Гомеопатия и здоровье.
9.20 «**Цыганка**». Телесериал (Аргентина).
10.05 «**Санта-Барбара**». Телесериал (США).
16.30 «Башня».
17.00 Кинотеатр «Россия». Комедия Марка Захарова «**Двенадцать стульев**». 1-я серия.
18.25 Сам себе режиссер.
19.50 Время кино. Премьера. Бен Кросс, Питер Уэллер в фильме «**Проклятие древней гробницы**» (Германия - Италия). 1-я серия.
20.50 Фигурное катание. Чемпионат мира. Парное катание. Короткая программа. Передача из Франции.
23.10 «Футбол + ТВ» с А.Вайнштейном. Тележурнал.
0.05 Телеспецназ: «Дежурная часть».
0.20 Магазин на диване.

КУЛЬТУРА

7.00 Программа передач.
7.05, **11.30**, **13.30**, **19.30**, **23.05** Новости культуры.
7.20 После новостей...
7.40 «**Раба любви**». Худ. фильм. («Мосфильм», 1975).
9.15 «Российский курьер». Кемеровская область.
9.55 Кино вчера и всегда. Авторская программа В.Божовича.
10.20 Поклонникам Терпсихоры.
10.35 «**Замок Олив**». Телесериал (Франция, 1992). 1-я серия.
11.40 «Бегемот Гуго». Мультфильм.
12.45 Шедевры мирового музыкального театра. У.Джордано. Опера «Андре Шенье». В постановке театра Ла Скала. 1-й, 2-й и 3-й акты.
15.00, **17.30** Новости.
15.10 Шедевры мирового музыкального театра. У.Джордано. Опера «Андре Шенье». В постановке театра Ла Скала. 4-й акт.
15.30 Кино - детям. «**Тайна Сагалы**». Телесериал (Польша - Германия, 1996).
15.55 Выступают пианист Д.Алексеев и оркестр Московской Государственной консерватории под управлением И.Шпиллера.
16.25 «Приблизиться к истине». Художник Е.Добыш.
16.35 «**Замок Олив**». Телесерил (Франция, 1992). Режиссер Николас Жессне. 1-я серия.
17.40 «Мир авиации». Тележурнал.
18.05 «Питер Брук». Авторская программа А.Бартошевича. Передача 2-я. «Мир без богов и надежд».
18.35 Вручение премии им. Д.Шостаковича О.Бородиной.
19.15 Вечерняя сказка.
19.25 Программа передач.
19.50 К юбилею И.Смоктуновского. А.П. Чехов. «Иванов». Спектакль МХАТа. Режиссер О.Ефремов. Часть 1-я.
21.15 После новостей...
21.35 К юбилею И.Смоктуновского. А.П. Чехов «Иванов».

НТВ

5.00, **5.30**, **5.45**, **6.00**, **6.30**, **6.45**, **7.00**, **7.30** «Сегодня утром».
5.15, **7.10** Спорт, погода.
5.20, **6.15** Криминал.
5.35, **6.50** Большие деньги.
5.50 Впрок.
6.20 Карданный вал.
6.35 Мультфильм.
7.15 Впрок.
7.45 Интересное кино.
7.55 Мир кино. «**Она написала убийство**» (США).
9.00, **11.00**, **13.00**, **15.00**, **18.00**, **21.00** Сегодня.
9.25 Мир кино. Фантастический фильм «**Воины-роботы**» (США).
11.30 «Старый телевизор» вспоминает. «**Место встречи изменить нельзя**». Заключительная часть.
13.30 Криминал. «Чистосердечное признание».
13.55 Сериал «**Улицы разбитых фонарей-II**».
15.35 Футбольный клуб.
16.25 Интересное кино.
16.35 Впрок.
16.50 Сериал «**Любовь и тайны Сансет Бич**».
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Премьера НТВ. Геннадий Хазанов. «Жил был я...»
19.50 Совершенно секретно.
21.45 Двое.
22.35 Сегоднячко.
23.15 Сегодня в полночь.
23.40 «Антропология».
0.15 «Футбольный клуб».

ТВ6

5.50 День за днем .
7.40 Дорожный патруль. Сводка за неделю .
8.00, **14.00**, **19.00**, **22.00** Новости.
8.10 Кинотеатр ТВ-6. Джеки Чан боевике «**Бесстрашная гиена 2**».
9.45 Телемагазин «Спасибо за покупку!»
10.00 Выборы 2000. Информационный выпуск.
10.20 «Скандалы недели».
10.50 «Катастрофы недели».
12.00 Выборы 2000. Информационный выпуск.
12.10 День за днем.
14.30 Сериал «**Никто кроме тебя**».
15.15 «Знак качества».
15.25 Телемагазин «Спасибо за покупку!»
15.40 Диск-канал .
16.10 Сериал «**Тарзан - защитник джунглей**».
16.40 Юмористический сериал «**Дежурная аптека**».
17.15 Дорожный патруль. Сводка за неделю .
17.30 «АМБА - ТВ».
18.00 Сериал «**Пси-фактор**».
19.25 «Место встречи».
19.45 «Вы очевидец».
20.40 Сериал «**Иллюзия убийства**», 1 серия.
21.40 Дорожный патруль .
22.15 «Аллё, народ!»
22.35 Кинотеатр ТВ-6. «**Космическая любовница**».
23.55 Диск-канал.
0.25 Дорожный патруль.

ТНТ

6.00 Мультсериал «Планета монстров».
6.30 Сериал для подростков «**Приключения швейцарской семьи Робинсон**».
7.00 «На свежую голову!»
8.00 Сериал «**Верность любви**».
9.00 Из жизни женщины.
9.25 Сонник.
9.30 Сериал «**За гранью возможного**».
10.35 Приключенческий сериал «**Сиквест**»'.
13.30 Сериал «**Сеньора**».
14.30 Сериал «**Незабываемая**».
15.30 Мультсериал «Планета монстров».
16.00 Сериал для подростков «**Приключения швейцарской семьи Робинсон**».
16.30 Из жизни женщины.
17.00 Комедия «**Я люблю Люси**».
17.30 Ток-шоу «Страсти по Соловьеву».
18.00 Удивительные животные.
18.25 «Глобальные новости». Астрологический прогноз Павла Глобы. (региональное окно)
18.30 Сериал «**За гранью возможного**».
19.30 Европейский футбол на ТНТ.
20.30 Драма «**Прощай, шпана замоскворецкая...**».
23.00 Глобальные новости».
23.05 «Лучшие матчи НХЛ»: «Лос-Анджелес Кингз» - «Бостон Брюинз».
0.15 - **0.45** Ток-шоу «Страсти по Соловьеву».

ТВЦ

5.00 «Настроение».
7.00 События.
7.15 «Настроение».
7.50 Киноканикулы. «**Волшебная лампа Аладдина**».
9.10 Сериал «**Узурпаторша**».
10.00 События.
10.15 Телеканал «Дата».
11.00 Сергей Юрский в телевизионном фильме «Евгений Онегин». Главы 1, 2.
12.15 Телеканал «Дата».
13.00 События.
13.30 Телесериал «**Лесси**».
14.00 Самый знаменитый криминальный сериал Европы «**Инспектор Деррик**».
15.00 «Регионы: прямая речь».
15.30 Молодежный телесериал «**Бестолковые**».
16.00 События.
16.15 «Да.» Программа для молодых.
16.45 «На пятачке». Хоккейное обозрение.
17.15 «Деловая Москва».
17.30 Тележурнал «Просто Россия».
18.00 «**Навсегда**». Телесериал (Мексика).
18.50 Смотрите на канале.
19.00 События.
19.55 Хоккей. Чемпионат России. Плей-офф. Финал. Передача из Дворца спорта «Лужники».
21.45 «Постскриптум».
22.00 События.
22.15 «Времечко».
22.45 «Ночной полет».
23.15 «Петровка, 38».
23.25 «**Сказки с того света**». Телесериал (США).

В течение недели в программе ТВ возможны изменения.

Чацвер, 30 сакавіка

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00(с сурдопереводом), 19.00, 0.10 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 «Сегодня с вами...» Генеральный директор Белорусского агентства содействия иностранным инвестициям Вадим Титовец.
8.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
9.15 Королевская охота.
9.45 Мультфильм.
10.05 «Вас вызывает Спортландия». Телетурнир по детским подвижным играм команд школьников г.Солигорска.
11.10 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал (Колумбия).
11.50 Наш край. «Шедевры Национального художественного музея. Художник Валентий Ванькович».
12.10 Телевизионный Дом кино. «Мужской разговор». Кинооператор Д.Зайцев.
12.35 Документальный экран. «Послесловие к финишу»(ТО «Телефильм»).
13.15 Дневной сеанс. «Кешка и гангстеры», «Кешка и фрукты», «Кешка и спецназ». Короткометражные худ.фильмы.
14.05 «Песню берите с собой». Телефестиваль белорусской песни.
15.10 Сериал для детей. «Тайный мир Алекс Мак».
15.35 Видеокурс итальянского языка. Передача 18-я.
16.05 Видеокурс английского языка. Передача 44-я.
16.30 «Велутские пряхи». Телеочерк о народных мастерах Лунинецкого района.
17.15 «А музыка звучит...» Песни на стихи Владимира Мазго.
17.45 Усадьба. Программа для дачников.
18.10 К 100-летию со дня рождения кинорежиссера В.В.Корш-Саблина. «Вместе с ним». Док.фильм (ТО «Телефильм»).
18.40 Международные спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 «Кофе с ароматом женщины». Телесериал.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 «Д'Артаньян и три мушкетера». Худ.фильм. 2-я серия.
23.35 Крок-2. Программа по письмам телезрителей.
0.05 Криминальная хроника.

ОРТ

8.00 Новости
8.15 «Нежный яд». Сериал
9.15 Маски-шоу
9.45 Человек и закон.
10.25 Вкусные истории
10.30 Сериал «Новые приключения Синдбада»
11.00 Новости.
13.30 Программа «Вместе»
14.00 Новости.
14.20 Мультазбука
14.45 Семь бед - один ответ
15.00 Программа «100%»
15.25 ...До 16 и старше
16.00 «Нежный яд». Сериал
17.00 Новости.
17.30 «Каламбур». Юмористический журнал
18.00 Процесс
18.40 Погода
18.45 Впервые на телевидении. Сериал «Огнем и мечом»
19.45 «Спокойной ночи, малыши!»
20.00 Время. Информационный канал
21.00 «Оскар-99». Лучший фильм лучшего актера «Жизнь прекрасна»
23.05 Новости. Ночной выпуск
23.25 Фигурное катание. Чемпионат мира - 2000. Передача из Франции

РТР

7.00, 8.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.20 Телеспецназ: «Дежурная часть».
7.35 Семейные новости.
8.20 Квантовая медицина.
8.35 Ура! Каникулы! «Малыш и Карлсон», «Веселая карусель». Мультфильмы.
9.00 «Гомеопатия и здоровье».
9.20 «Цыганка». Телесериал (Аргентина).
